Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 36 Вільня, Нядзеля 23 Кастрычніка 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год — 4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ

Нявыкарыстаная магчымасьць.

Палажэньне беларускай школы, як аб гэтым усе добра ведаем, проста трагічнае. З пачаткам сёлетняга школьнага году дзьве апошнія нашы гімназіі: у Вільні і Навагрудку, з прычыны цяжкага нашага палажэньня эканамічнага і палітычнага, перайшлі на ўласнасьць ураду. Праўда, пры нармальных адносінах факт гэткі быў-бы нават пажаданы, але пры адносінах фактычных Палякоў да Беларусаў прыходзіцца моцна баяцца за далейшы лёс гэных гімназіяў. Надтэ магчыма, што ў хуткім часе беларускасьці ў іх можа не аказацца і званьня. Беларусы аднак павінны аб гэтым заўсёды помніць і павінны ўжо пачынаць думаць аб заклаўзінах сваей беларускай прыватнай гімназіі, на першы пачатак хоць-бы ў Вільні.

Але йдзём далей. Паводле польскай афіцыяльнай урадавай статыстыкі існуюць такжа школы пачатковыя дзяржаўныя — беларускія і польска-беларускія. У мінулым (за год сёлетні ня маем вестак) годзе існавалі 22 такія школы беларускія і 41 польска-беларуская. Думаем, што паводле тэй-жа ўрадавай статыстыкі лічбы гэтыя мала зьмяніліся і ў сёлетнім школьным годзе. А калі наступіла зьмена, дык пэўне-ж на некарысьць гэтых школ. Але як паменшаньне іх, так і паявіўчэньне мала нас тут цікавіць, бо школы гэныя толькі завуцца беларускія, ці польска-беларускія, а фактычна яны, прынамся вялізарная большасьць з іх, ужо польскія, польскі нацыяналізм зьнішчыў іх бадай цалком.

Перастала ўрэшце існаваць так-жа і апошняя беларуская прыватная школа ў Шауляхах, Браслаўскага пав., бо пасьля многіх гадоў працы, вучыцельку гэнай школы на сёлетні год адміністрацыйныя ўлады чамусьці прызналі „niegrawomyślną“ і не далі ей „świadectwa moralności“.

Такім чынам, як бачым, на беларускім школьным фронце трагічна сумна. Больш двух міліонаў Беларусаў у Польшчы так як і ня маюць роднай сваей школы!

Але-ж уміраць ня думаем. Народ беларускі жыве, крапіцца і далей разьвівае сваю народную думку, чым можа і як можа. Вось-жа ў гэтай справе, на нашу думку, было-б дужа памоцным прыватнае, пазашкольнае навучаньне, на якое мы цалком не зварочваем увагі, якое ў нас зьуляецца сапраўды нявыкарыстанай магчымасьцяй і якое ў меру сіл нашых мы павінны выкарыстаць.

У Польшчы, як ведаем, існуе (з 1919 г.) прымусовае навучаньне дзяцей (ад 7 да 14 гадоў). Вось-жа паводле найнавейшых польскіх законаў загад гэны можна споўніць навучаньнем прыватным, пазашкольным, дома. Дзеля гэтага толькі трэба, каб да канца жніўня месяца бацькі падалі вучыцелю дзяржаўнай найбліжэйшай школы, або школьнаму інспэктару адпаведныя дэклярацыі, што дзеці іх будуць вучыцца дома і што вучыць іх будзе такі і такі вучыцель. Гэткія дэкляарацыі вучыцель, ці інспэктар мусіць прыняць і выдаць паквітаваньне. Дзеці, якія астаюцца вучыцца дома, павінны прайсьці навукі згодна з вымогамі для пачатковых дзяржаўных школ.

З права дамашняга навучаньня карыстаюць многія дзеці польскія, а так-жа і літоўскія. Трэба права гэта выкарыстаць і для дзяцей беларускіх. Ёсьць у нас па сёлах нямала безработных беларускіх вучыцялёў, якія, выкарыстваючы магчымасьць пазашкольнага навучаньня, у справе прасьветы беларускіх дзетак маглі-б аказаць вялікую прыслугу.

Праўда, сёлета парушаць гэту справу ўжо позна, але пішам гэта дзеля таго, каб справай гэтай заняцца абавязкава у будучым школьным годзе, а каб за сёлетні школьны год адпаведна да яе прыгатавацца.

Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры павінен узяць справу пазашкольнага навучаньня беларускіх дзетак да сэрца, разьведаць усе фармальнасьці, знайсьці адпаведных вучыцялёў і папрабаваць павясьці змаганьне за родную прасьвету і на гэтым, дагэтуль яшчэ нечапаным, фронце.

Праваслаўе і унія.

Чытаючы „Б. Крыніцу“ я зьвярнуў увагу, што яна многа месца прысьвячае асьвятленьню рэлігійнага жыцьця ў Беларусі. Уважаю, што гэта, як для хрысьціянска-дэмакратычнага органу зусім адпаведная рэч. Вось-жа ў гэтым артыкуле хацеў-бы я падзяліцца думкамі з чытачамі гэтай часопісі аб справе уніі з пункту гледжаньня праваслаўнага.

Як усім ведама, Праваслаўная Царква ёсьць апанавана на нашых землях чужынцамі, так як і Каталіцкі Касьцёл. Каб збавіцца ад гэтага чужога і няпрыхільнага да беларускаў элемэнту ў Праваслаўнай Царкве некаторыя радзяць кідаць яе і шукаць ратунку ў уніі, або ў якой іншай форме аддзяленьня ад праваслаўя. Я аднак стаяў-бы на тым становішчы, што нам праваслаўным ня трэба шукаць ратунку ў выхадзе з Праваслаўнай Царквы, але ў нутры самой Праваслаўнай Царквы пачаць рашучае змаганьне за правы належныя беларускаму народу.

Ня буду тут гаварыць аб іншых выхадах з сяньняшняга цяжкага палажэньня, якое стварылася ўнутры Праваслаўнай Царквы для веручых наагул, а для нас беларусаў у асобнасьці, а пагавару толькі аб той форме выходу, якая завецца унія.

Як я ўжо ўспомніў, апошнім часам можна часта пачуць галасы пасярод сьведамых беларусаў, што найлепшым спосабам ратаваньня беларускасьці ў рэлігійным жыцьці будзе пераход у унію. У уніі — кажуць прыхільнікі яе — будуць дадзены беларусам поўныя народныя правы ў рэлігійным жыцьці, ня так як у Праваслаўнай Царкве або Каталіцкім Касьцеле.

Я аднак дзяржуся іншага пагляду і уважаю, што унія беларускай народнай ідэі не паратуе і ня дасьць беларусам таго, чаго яны ад яе спадзяюцца. А думаю гэтак дзеля наступных прычын:

1. Унія ў Польшчы будзе заўсёды залежная ад польскага ўраду ня менш як цяпер праваслаўе, а можа яшчэ і больш. А гэтая залежнасьць нічога добрага беларусам не варожыць. Як усім ведама, польскія кіраўнічыя кругі (духоўныя і сьвецкія) хацелі-б пры помачы уніі (так як гэта было даўней) спалянізаваць беларусаў. Калі гэтыя кругі патрафілі накінуць польшчыну ўжо цяткова нават Праваслаўнай Царкве (па некаторых царквах пяюць ужо „Boże coś Polskę“), то трудна дапусьціць, каб унія была мацнейшая. У скорым часе унія, пры адпаведным націску і ўмелай палітыцы гэтых-жа польскіх кіраўнічых кругоў, можа стацца мостам вядучым да хутчэйшай голёнізацыі беларусаў, чым гэта дзеіцца пры помачы праваслаўя.

2. Да гэтай сьвецкай палітыкі трэба дабавіць палітыку духоўную. Як ведама, унія цяпер знаходзіцца ў залежнасьці ад тых самых польскіх біскупаў, ад якіх залежны і Каталіцкі Касьцёл з беларусамі-каталікамі. А імкненьні гэтых польскіх біскупаў мы добра знаем, паміж іншым і з старонак «Б. Крыніцы», якая бадай у кожным нумары раскрывае іх падходы да беларускага народу. Дык прыняўшы унію і разам з гэтым паддаўшыся пад кіраўніцтва гэтых біскупаў, што выйграваюць беларусы праваслаўныя, глядзячы з пункту народнага? Думаю, што нічога, а можа яшчэ і страцілі-б.

Тут хацеў-бы я спытацца прыхільнікаў уніі, а што цяпер унія дала беларусам? Ці унія стварыла кадры беларускага духавенства? Ці па ўсіх унійных царквах ушанавана беларуская мова? Ні адно, ні другое. Наколькі мне ведама, у гэтых царквах і далей пануе расейшчына або — уводзіцца польшчына. Што да польшчыны, то зьвярну ўвагу на адну цікавую праяву, якая кідаецца ў вочы і шмат гаворыць аб адносінах да яе польскіх кругоў: калі дзе-ня-дзе праваслаўныя прымаюць унію, то польскія сьвецкія і духоўныя кругі глядзяць на іх як на прыбліжаных да польшчыны, ужо куды бліжэйшых за праваслаўных і ўважаюць як-бы за паўпалякоў, да якіх ужо можна, а нават і трэба гаварыць папольску.. Гэта характэрная праява многа гаворыць аб настроях з таго боку.

3. Прыхільнікі уніі паклікаюцца на тое, што за уніятаў, як за каталікоў усходняга абраду, заступіцца Рым і ня дасьць іх у абіду. Аднак я ня бачу гэтага заступніцтва дзеля гэтакіх прычын: а) рымская палітыка прымушана лічыцца з палітыкай кожнай дзяржавы і дзеля народных ідэалаў нейкай народнай меншасьці ня будзе ствараць канфліктаў з дзяржавай, чаго прыкладам ёсьць канкардат паміж Рымам і Польшчай з 1925 г. Рым, як інтэрнацыянальная ўстанова, мала зварочвае ўвагі на нацыянальныя імкненьні кожнага народу. У Рыме прывыклі лічыцца з дакананымі фактамі ў адраджэньні кожнага народу. Калі-б беларускі народ здабыў для сябе незалежнасьць і збудаваў сваю дзяржаву, то ясная рэч, што Рым тут прызнаў-бы. Але памагаць беларусам у іх адраджэньні Рым ня будзе, бо ён не памагаў ніводнаму народу; дый урэшце гэта не яго дзялянка працы; б) Рым нічога не памог беларусам-лаціньнікам, то і з гэтага можна зрабіць вывад, што не паможа і беларусам — уніятам.

Рым мае прадусім рэлігійныя, інтэрнацыянальныя заданьні. Працуючы для гэтага рэлігійнага інтэрнацыяналу, Рым, праўда, закладаў часам спэцыяльную калегіі і акадэміі для аддзельных народаў, як напр. немцаў, палякоў, украінцаў і інш. А для беларусаў? Дагэтуль нічога. Нават тады, калі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі выдаў несправядлівы загад, забараняючы чытаць „Б. Крыніцу“ і належаць да БХД, Рым маўчаў, хоць да яго зьвярнуліся прадстаўнікі БХД з просьбай заступніцтва. Значыць, беларусы ў Рыме ня змогуць знайсьці для сябе належнай абароны, каб нават прынялі унію.

Дык асталося адно — у нутры Праваслаўнай Царквы змагацца за правы беларускага народу. Праўда, змагароў на гэтай ніве яшчэ мала, але ўжо ёсьць знакі, якія сьведчаць, што гэтыя змагары нарастаюць. Гэтымі знакамі будуць штораз часьцейшае зьяўляньне беларускіх праваслаўных часопісаў, якія ставяць сабе мэту: здабыць поўныя правы для беларускага народу ўнутры праваслаўнай Царквы. Гэтакай дарогай мы павінны ісьці...

Праваслаўны дзеяч.

Беларусаў пад Польшчай, паводле апошняй перапісі насельніцтва, ёсьць 1 500.000 душ.

Самі беларусы лічаць, што ў Зах. Беларусі беларусаў ёсьць каля 2-х з палавінай мільёнаў. Польскія статыстыкі лічаць розна, адзін раз так, другі—інакш. Апошняя перапісь насельніцтва ў Польшчы, якая праведзена год таму, налічвае беларусаў менш-больш адзін мільён пяць сот тысяч. Як гэта апошняя перапісь праводзілася, кожны беларус ведае, а дзеля гэтага гэны паўтарамільённы лік беларусаў — гэта цьвёрды народна беларускі элемэнт.

А значыць, памімэ ўсялякіх труднасьцяў, расьцём і верым, што расьці будзем.

10-лецьце Літоўскага Банку.

Сёлета мінула 10 гадоў, як у Незалежнай Літве пачаў сваю працу Літоўскі Дзяржаўны Банк.

У канцы 1922 г. Літоўскі Ўрад паручыў Дзяржаўнаму Банку выконваць усякія скарбовыя і касавыя дзяржаўныя опэрацыі. Восьж-жа тады Банк гэты і прыступіў да паручанай яму працы. Між іншым пачаў ён закладаць свае аддзелы так-жа і на правінцыі і там пашыраць сваю дзейнасьць.

Цяпер Літоўскі Банк мае 26 аддзелаў і 489 працаўнікоў у іх. Праз увесь час свайго існаваньня Банк гэты разьвіваецца памысна, парадкуе літоўскія фінансавыя справы, памагае працаваць і разьвівацца другім банкам, паддзержывае промысел, гандаль, сялянскія гаспадаркі, дае пазыкі і сьцерэжэ Літву ад розных гаспадарчых труднасьцяў.

Але найбольшай Літоўскага Банку заслугай зьяўляецца стабілізацыя літоўскіх фінансаў. Дзякуючы яго чуйнасьці і стараньням праз увесь час, аж да сяньня, літ літоўскі заўсёды сталы, ніколі не вышаў з граніц свае вартасьці, што часта ў нашых цяжкіх часах здараецца нават у старых і ў больш багатых дзяржавах. Усе, пэўна, памятаем, як нешта год таму скакаў ангельскі фунт, а літ далей аставаўся непарушны. Дзеля гэтага літоўскія грошы — літы на міжнародным рынку заўсёды мелі і маюць давер і ахвотна там былі і ёсьць купляныя.

Сьвяткаваньне ў Коўне дзесяцілецьця Банку адбылося 2 гэтага месяца. У гэты дзень адбылося ўрачыстае паседжаньне Управы Банку, на якім быў Прэзыдэнт А. Сметона, Арцыб.-М трапаліт Скварэцкіс,міністр-прэм'ер і шмат высокіх урадаўцаў. На паседжаньні гэтым дырэктар Банку Сташынскі сказаў прамову, у якой апісаў гісторыю Банку, яго працу і сучаснае яго, цалкам здаваляючае, палажэньне.

На заканчэньне прамовіў Прэзыдэнт, падчыркваючы, што літоўскім грошам і надалей не грозіць нічога.

М. К.

Упадак землеробства і картэлі.

— Польшч, таксама як і наша краіна, фактычна ёс ць дзяржавай больш землеробскай, як прамысловай. Гаспадарчы крызыс у першую чаргу абхапіў землеробства і моцна яго прыдушыў. У выніку гэтага землеробства ў Польшчы пачало ўпадаць.

Рэестрацыя хатняй жывёлы, праведзеная ў чэрвені с. г. паказвае, што ў Польшчы пачаў зьменшацца жывы інвэнтар. І так:

У параўнаньні з прошлым годам коняў зьменшылася на 5 працэнтаў. Рагатай жывёлы зьменшылася на 3 працэнты. Сьвіней — больш як на 20 процантаў, авец зьменшылася на 3 з палавінай процантаў.

— У Польшчы існуе ўжо больш 100 розных прамыслова-гандлёвых картэляў (саюзаў), якія змагаюцца супольным фронтам за ўтрыманьне магчыма высокай цаны на свае тавары. Вялікая прамысловасьць, як нафтовая, жалезная, мануфактурная і інш., у картэлі ўжо зарганізавана. Цяпер гатовіцца новы гэткі картэль шавецкі. Калі зарганізуецца гэты картэль, то промысел абутку апынецца ў рамах сьціслай арганізацыі пад кантроляй ураду.

— Усім ведама, што сернікавы манаполь у Польшчы аддана ў арэнду. Сернікі каштуюць вельмі дорага, бо аж 10 грашоў скрыначка. Дзеля абніжэньня цаны на сернікі ўрадавыя прадстаўнікі зьвярнуліся да гэтых арэндатараў — заграничных капіталістаў, але арэндатары і слухаць ня хочуць. Яны заявілі, што кож ая скрыначка сернікаў дае ім толькі(?!)4 грошы,бо плаціць у дзяржаўны скарб падатку ад скрыначкі сернікаў 4 грошы, а рэшта даюць зарабіць крамнікам: гуртоўням і дэталістам.

— Мала продукцыйная вялізарная гаспадарка графа Патоцкага апошнімі часамі апынулася пад націскам дзяржаўных падаткаў. У Баранавічах гэтымі часамі маемасьць графа Патоцкага была пастаўлена на ліцытацыю (Патоцкі мае незаплачанага падатку мільёны зл.), але ліцытацыя не адбылася, бо вышэйшыя ўлады прыказалі ліцытацыю спыніць.

п.

Трагедыя сялянства.

Сучаснае жыцьцё сялянства і апісаць трудна. Адно гора: усё патрэбнае ў гаспадарцы і чаго селянін сам на сваей гаспадарцы зрабіць або выпрадукаваць ня можа, вельмі дарагое, а землеробскі прадукт, жывёла, якую гадуе сел нін і ўсё, што вёска вырабляе, ідзе за бясцэн, чуць не за дарма. Пры гэтым падаткі такія-ж самыя, як і 4—5 гадоў таму назад. Гаспадарчыя даўгі, забабязаньні, на якія селянін падпісаўся5—6гадоў таму, маючы на ўвазе праз доўгія гады сплаціць іх і гэткім спосабам пашырыць свой зямельны варстат працы, дакупляючы 2—3 гэктары зямлі, заядаюць селяніна.

У гэтым нумары „Б. Крыніцы“ зьмяшчаем карэспандэнцыю пад загалоўкам „Труднае палажэньне“, у якой малюецца абраз сялянскай трагедыі, асабліва тае часткі сялян, якая рупілася пашырыць свае вузкія загоны і веручы толькі ў свае ўласныя сілы, прыкупляла з суседніх двароў кавалачкі зямлі ў доўг, нават за вельмі высокую цану, спадзяючыся, што ў разсрочку праз доўгія гады гэты доўг здолее выплаціць.

У тыя часы, калі за пуд жыта плацілі 6—8 зл., а за карову 250—300 і 350 зл., за пуд сьвіньні плацілі 35—40 зл. і больш, а за каня 500—600 і 800 зл., дбаючыя аб разьвіцьці гаспадаркі — сяляне прыкуплялі ад збанкрутаваўшага двара зямлю і па высоканеда тупнай цане. Але прышоў час, што з даходу сялянскай гаспадаркі нельга заплаціць адных падаткаў, а аб сплаце даўгоў і гутаркі няма. Апрача гэтага асталіся-ж яшчэ і патрэбы штодзенныя, як гаспадарчыя так і асабістыя. Словам трагедыя, бо на гаспадарцы ня ўтрымаешся і пайсьці няма куды.

п—к.

З беларускага жыцьця.

„Самапомач“ беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопісь (месячнік) № 1 ужо выйшла з друку і паступіла ў продаж. Пошта высылаецца толькі па атрыманьні пісьменнага заказу. Адрэс: Вільня (Wilno), Полацкая 4—10. Грошы надсылаць на чэкавае конто ў П. К. О. (konto czekowe P. K. O.)інж. Клімовіча № 180.485. Цана асобнага нумару 40 гр. Падпісная плата на год выносіць 3 зл., на паўгода 1,75 зл., на 3 месяцы — 1 зл.

Справаздачу аб гэтай часопісі дамо ў наступным нумары. Тут-жа агранічымся толькі да зацемкі, што часопісь „Самапомач“ мусіць чытаць кожны; асабліва-ж селянін-земляроб знойдзе тут цэнныя гаспадарчыя рады,

ПРАГРАМА Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі.

(Перагледжаная і зацьверджаная на Зьездзе дня 13.XII.1931 г. ў Вільні).

І. Палітычныя мэты

§ 1. БХД, стоячы на грунце самаставаўленьня народаў, імкнецца да самастойнасьці Беларускага Народу на ўсіх яго землях, аб'яднаных у незалежную дэмократычную рэспубліку.

II. Адносіны да суседзяў.

§ 2. БХД лічыць сваім ідэалам добрасуседзкія адносіны з усімі народамі на падставе сапраўднай вольнасьці і роўнасьці.

§ 3. З пагляду палітычнага і гаспадарчага БХД уважае карысным, каб незалежная Беларуская Рэспубліка ўвайшла ў эканамічны і палітычны саюз з суседнімі народамі, з якімі лучаць яе супольныя інтарэсы.

III. Шлях да мэтаў.

§ 4. БХД да сваіх мэтаў ідзе дарогай арганізаваньня, усьведамляньня і ўзгадаваньня беларускага сялянства, работнікаў і інтэлігенцыі на грунце хрысьціянска-дэмократычных ідэалаў і беларускай народнай культуры. Дзеля гэтага БХД рупіцца закладаць беларускія школы, народныя дамы, ладзіць лекцыі, рэфэраты, зьезды, выдае газэты і інш.

БХД прыймае ўдзел у дзяржаўных і самаўрадавых выбарах, ідучы шляхам палітычнага і соцыяльнага змаганьня да незалежнасьці і самастойнасьці Беларускага Народу, да свабоды яго культурнага і эканамічнага разьвіцьця.

IV. Самаўрады.

§ 5. БХД уважае, што гмінныя, паветавыя і ваяводзкія самаўрады ў сваіх мяйсцовых справах павінны быць незалежнымі ад цэнтральных і мяйсцовых адміністрацыйных уладаў.

§ 6. Да компэтэнцыі самаўрадаў належаць справы самаўрадавыя: адміністрацыйныя, гаспадарчыя, школьныя, зямельныя, апека над сіротамі, хворымі, калекамі, беднымі і г. д.

§ 7. Самаўрады маюць свой бюджэт Недахват гэтага бюджэту на вышэйназначаныя мэты (§ 6) пакрывае дзяржава.

§ 8. Самаўрады выбіраюцца агульным, простым, тайным, роўным і пропорцыянальным галасаваньнем.

§ 9. Выбары ў самаўрады павінны адбывацца свабодна, бяз ніякага націску з боку адміністрацыйных уладаў.

V. Войска.

§ 10. БХД змагаецца з палітыкай мілітарызму і імкнецца да замены сталай арміі народнай міліцыяй.

§ 11. Вучэньне народнай міліцыі павінна адбывацца на мяйсцох і ў вольным ад гаспадарскіх работ часе.

VI Палітычная і грамадзкая свабода.

§ 12. Усе грамадзяне павінны быць роўныя перад правам.

§ 13. Павінна быць поўная свабода сходаў, друку, слова, сумленьня, арганізацыі таварыстваў і прафэсыянальных саюзаў.

§ 14. БХД дамагаецца поўнай свабоды выбараў у дзяржаўныя ўстановы.

§ 15. Кожная нацыянальнасьць мае права карыстацца сваей мовай у агульна-грамадзкім і палітычным жыцьці.

VII. Суд.

§ 16. Суд павінен быць незалежны ад палітычных кірункаў і ад адміністрацыі.

§ 17.Міравыя суды складаюцца з выбранага народам судзьдзі і таксама выбраных лаўнікаў.

§ 18. Ува ўсіх важнейшых уголоўных і палітычных справах прыгавары пастанаўляюцца судамі прысяжных.

§ 19. Палявыя (надзвычайныя) суды павінны быць скасаваны.

§ 20. БХД—проціў кары сьмерці.

VIII. Школа.

§ 21. Пачаткавае навучаньне абавязкавае для ўсіх, бясплатнае і ў роднай мове вучняў.

§ 22. Навучаньне прыватнае карыстаецца такімі-ж правамі, як і ўрадавае.

§ 23. Аднальковая дапамога ўрадавая як школам прыватным, так і ўрадавым.

§ 24. Навучаньне рэлігіі кожнага вызнаньня адбываецца абавязкава, як у школах урадавых, так і прыватных, у роднай мове вучняў.

§ 25. Закладаньне народных унівэрсытэтаў і зашкольная асьвета—на кошт дзяржавы.

а інтэлігент — пазнаёміцца з асновамі і варункамі грамадзкай працы.

Кожны чытай „Самапомач.“

Што дзеецца з Т-вам Беларускіх Абсольвэнтаў Вышэйшых Школ. Як мы ўжо ў сваім часе пісалі, беларусы — абсольвэнты Вышэйшых Школ, бяз розьніцы палітычных паглядаў, вясной сёл. году сарганізаваліся ў Т-ва Беларускіх Абсольвэнтаў Вышэйшых Школ і падалі польскім уладам на зацьверджаньне свой статут. Новае Т-ва ставіла сабе ў статуце мэты выключна культурна — навуковыя і самадапамаговыя. Ня глядзячы на гэта, да апошняга часу (5-ты месяц!), як нас інфармуюць, на просьбу аб легалізацыі статуту т-ва няма ніякага адказу.

Ня будзем тут бавіцца у дагадкі, што знача такое адцягіваньне і якія будуць гэтага канцы. Зазначым толькі, што само адцягіваньне нават такой справы паказвае, як далёка ў Польшчы да раскрычанай Бэ-Бэкамі толеранцыі да праяваў беларускага руху, нават культурна-навуковага!

З украінскага жыцьця.

Англійцы аб украінцах. На апошнюю сэсію Лігі Народаў была падана пэтыцыя англійскіх паслоў у справе невыкананьня Польшчай узятых на сябе забавязаньняў аб увядзеньні аўтаноміі для Украінцаў у Ўсходняй Галіччыне. Англійцы прапануюць перадаць цэлую гэту справу ў Пастаянны Міжнародны Грыбунал Справядлівасьці ў Газе. — Трэба ведаць пры гэтым, што паводле міжнародных дагавораў, Польшчы даным быў мандат на Усходнюю Галіччыну толькі на 25 гадоў (ад 22.XII.1919 г.) і да таго з варункам, што тамашнім Украінцам будзе дана шырокая аўтаномія.

Гэта забавязаньне Польшчы дагэтуль — 13 гадоў! —нявыканана і дзеля таго пытаньне Усходняй Галіччыны на міжнародным грунце становіцца што раз вастрэйшым і ўцягівае ў сябе шторазь шырэйшыя кругі.

Вобыскі й арышты сярод украінскіх студэнтаў. 12 г. м. паліцыя зрабіла вобыск у Украінскім Акадэмічным Доме у Львове. Арыштавана было пры гэтым шмат украінскіх студэнтаў, часьць каторых пасьля допросу была звольнена.

З Польшчы.

Сэсія Сойму. Газэты падаюць, што бюджэтная сэсія Сойму пачнецца 3 лістапада.

Вялікі палітычны працэс. У Лодзі хутка адбудзецца суд над 36 сябрамі П.П.С.-лявіцы. Гэта ёсьць эпілёг ліквідацыі гэтай партыі, якая абвешчана нелегальнай у лістападзе мін. году. Абвінавачаных будуць бараніць 53 адвакаты. На расправу паклікана некалькісот сьведкаў.

Пяць прысудаў сьмерці. Апошнімі часамі даразныя суды засудзілі аж 5 чарговых ахвяр людзкога зьдзічэньня на кару сьмерці, а іменна: у Грудзёндзу Э. Т. Плітту—за шпіянаж, у Любліне Ул. Гоффмана—за шпіянаж, у Нясьвіжы П. Крыцкага—так-жа за шпіянаж, у Берасьці—Я. Кравчука і ў Коўлі—В. Уласа.

Сьмерць выдатнага адваката — Сьмяроўскага. У мінулым тыдні памёр у Варшаве ведамы і беларусом выдатны польскі адвакат Э. Сьмяроўскі. Нябошчык у некаторых паважнейшых палітычных працэсах над беларусамі выступаў у абароне абвінавачаных і сумленна бараніў іх прад судом.

„Працэс берасьцейскі — справаздача з судовай расправы ад 26 кастрычніка да 3 студня 1932 г.“ Пад такім загалоўкам выйшла ў Амэрыцы папольску кніжка, але ў Польшчы прадаваць яе ўрад забараніў.

З заграніцы

Ліга Народаў, ня могучы зрабіць нічога позытыўнага, на апошняй XIII чарговай сэсіі абмежавалася ў сваей дзейнасьці нутранымі справамі, каб падтрымаць свой састарэлы арганізм і дня 17 г. м. перарвала нарады.

Гэтая сэсія Лігі ня выклікала ў міжнароднай палітыцы ніякага зацікаўленьня. Нават дэлегаты прыбыўшыя на сэсію Лігі гэтымі нарадамі ня цікавіліся. Словам, старушка Ліга сталася ўжо няцікавая на міжнароднай арэне.

Нядошлая конфэрэнцыя. Пасьля таго, як Нямеччына затрэбавала для сябе роўнапраўнасьці ў збраеньнях, Англія хацела ўціхамірыць яе і падала прапазыцыю склікаць конфэрэнцыю 4-ох дзяржаў: Францыі, Англіі, Італіі і Нямеччыны. Але, як пачалі гатовіцца да гэтай конфэрэнцыі, падняўся шум у міждзяржаўнай эўропэйскай палітыцы і прышлося гэту конфэрэнцыю адлажыць на неакрэсьлены час, каб толькі не дражніць зацікаўленых у слабасьці Нямеччыны

У Манджурыі ўзноў пачаліся крывавыя баі. Кітайскія паўстанцы ў некаторых мяйсцох перамагаюць японскае войска. Паўстанцы заўладалі вузлавой станцыяй чыгункі Ціцікар і прарвалі комунікацыю з Мукдэнам.

Крывавыя разрухі ў Вене. У мінулую нядзелю ў Вене (Аўстрыя), падчас дэманстрацыі нямецкіх народных соцыялістаў (гітлераўцаў), дайшло да крывавых сутычак з соцыял-дэмакратамі (шуцбунд). У выніку гэтай сутычкі 4 асобы забітыя і 23 ранена.

Запас золата ў Францыі і ў Польшчы. Апошняя справаздача Француcкага Банку паказвае, што Францыя мае ў запасе залата на 82 мільярды франкаў. У абег выпушчана паперавых грошай на 80 мільярдаў франкаў. З гэтага выглядае, што францускія паперавыя франкі маюць больш як поўнае пакрыцьцё золатам.

Польскі Банк мае ў запасе золата на 483 мільёны злотых. У абег выпушчана паперавых грошай на 1 мільярд 11 мільёнаў злотых. З гэтага выглядае, што польскія паперавыя злотыя маюць пакрыцьцё золатам менш-больш толькі 40 процантаў.

Калі-б уласьнікі паперавых францускіх франкаў і польскіх злотых зажадалі вымяняць паперкі на звонкія залатыя грошы, то Францускі Банк за франкі мог-бы выплаціць золатам, ды яшчэ асталося-б ў запасе, а а Польскі Банк мог-бы заплаціць за паперавыя залатоўкі толькі па 40 грашоў.

Публічная здрада Царквы. Апошнімі часамі ў Маскве адбываўся камуністычны суд над праваслаўным біскупам Доміціянам, каторагабальшавікі абвінавачвалі за агітацыю проціў(?): колектывізацыі. Прад судом проціў біскупа сьведчылі два праваслаўныя сьвяшчэньнікі Пятроўскі і Антыпаў. Падчас свайго паказаньня Пятроўскі зьняў з сябе крыж і кінуў яго аб зямлю, гаворачы, што яму цяпер адкрыліся вочы і заявіў, што адступае ад Царквы. Антыпаў так-жа кінуў крыж і расу біскупу пад ногі. Біскуп заплакаў, падняў крыж з зямлі, пацалаваў і заціскаючы ў жмені прыціскаў яго да грудзей. Суд засудзіў біскупа на 8 гадоў катаргі.

З краю.

АБЛАВА НА ВАЎКОЎ. У палавіне г.м. у Слонімшчыне адбылася вялікая аблава на ваўкоў, у якой бралі ўдзел 35 стральцоў, і 400 заганятых. Але застрэлілі толькі аднаго ваўка і 2 ранілі. Мяйсцовая люднасьць з гэтай аблавы нездаволена і дамагаецца аблавы другой, бо ваўкі робяць шмат шкоды.

СУД У НАВАГРАДКУ гэтымі днямі засудзіў за камуністычную дзейнасьць С. Цехановіча на 4 гады вастрогу.

ЗА СКАЛЕЧАНЬНЕ З ЗАЙЗДРАСЬЦІ 3 ГАДЫ ВАСТРОГУ. Надовячы акружны суд у Навагрудку разглядаў справу Ольгі Давідчыковай, якая з зайздрасьці за мужа выпаліла вочы вітрыволям сваей кумпанцы М. Бэкішанцы. Давідчыкову суд засудзіў на 3 гады вастрогу.

Мала прачытаць газэту самому:
трэба
яе прачытаць сабраным суседзям разам

§ 26. Незалежнасьць школьных уладаў і школьнага навучаньня ад уладаў адміністрацыйных.

IX. Рэлігія.

§ 27. Касьцёл (Царква) у сваім унутраным жыцьці карыстаецца з поўнай свабоды і кіруецца кананічным правам.

§ 28. Касьцёл (Царква) у жыцьці грамадзкім карыстаецца з усіх правоў палітычных і грамадзкіх нароўні з іншымі ўстановамі і грамадзянамі дзяржавы і спаўняець такія-ж самыя абавязкі, як і ўсе грамадзяне дзяржавы.

§ 29. БХД прынцыпова проціў разьдзелу Касьцёла (Царквы) ад дзяржавы і змагаецца з палітыкай выкарыстоўвуючай рэлігію для палітычных мэтаў, або паддзержываючай адну рэлігію проціў другой.

§ 30. Спрэчныя справы між Касьцёлам (Царквой) і дзяржавай вырашаюцца палюбоўна, дарогай узаемных дагавораў і ўступак.

§ 31. БХД, у межах Кананічнага права, у жыцьці касьцельным (царкоўным) на беларускіх землях змагаецца за поўныя правы беларускай мовы.

§ 32. БХД змагаецца за тое, каб жаніміства і агулам справы сям'і апіраліся на асновах хрысьціянскай моральнасьці.

X. Прыватная ўласнасьць.

§ 33. БХД прызнае, што прыватная ўласнасьць ёсьць падставай цывілізацыйнага поступу грамадзянства. Аднак уважае, што ўласнасьць, зграмаджаная ў вялікай меры ў прыватных руках, ёсьць крыўдай для працоўнага народу і дзеля гэтага БХД змагаецца з абшарніцтвам і капіталізмам.

§ 34. БХД пераканана, што прыватная ўласнасьць, абапёртая на працоўнай норме, даючы ня толькі правы, але накладаючы і грамадзкія абавязкі, памагае выпрабленьню ў людзях ініцыятывы, самавітасьці і грамадзкай свабоды.

§ 35. БХД не праціўіцца, каб прыватная ўласнасьць, калі гэтага вымагае дабро шырокіх працоўных масаў, пераходзіла ў формы колектыўныя (грамадзкага валаданьня). Аднак БХД проціў такой колектывізацыі, якая накідваецца згары і праводзіцца сілаю.

§ 36. БХД ўважае, што ўсе рэформы прыватнай уласнасьці павінны праводзіцца згодна з інтарэсамі беларускай народнай эканомікі.

XI. Зямля.

§ 37. Асновай зямельнай гаспадаркі служыць працоўная норма.

§ 38. Усе землі, перавышаючыя працоўную норму, перадаюцца на ўласнасьць і бяз выкупу беззямельным і малазямельным сялянам.

§ 39. Працоўную норму зямлі становіць такі лік дзесяцін, які гаспадар можа абрабіць сам, з сваей сям'ёй, або так-жа пры помачы аднаго-двух наймітаў у тым выпадку, калі ў якой сям'і, з прычыны малалецтва дзяцей, старасьці, хваробы, калецтва, удоўства з малымі дзяцьмі і г. п. недахват рабочых сілаў для абрабляньня працоўнай нормы.

§ 40. Мясцовыя самаўрады могуць мець запас зямлі, як народную ўласнасьць, для мэтаў агульна-грамадзкіх.

XII. Упарадкаваньне зямлі.

§ 41. БХД змагаецца за такое ўпарадкаваньне зямлі і за такую зямельную гаспадарку, якая давала-б найболей даходу грамадзянству і дзяржаве. Такою гаспадаркай БХД лічыць працу на хутарах або на суцэльных зямельных надзелах (адрубах), якія-б злучылі ў вадну гаспадарчую цэласьць усе шнуры і нарэзкі.

§ 42. Пераход на хутары або на злучаныя надзелы (адрубы) праводзяць сялянскія зямельныя камісіі пры самаўрадах, за згодаю самых сялян, прычым малазямельныя гаспадаркі павінны быць дапоўнены.

§ 43. Сяляне, разам з зямельнай камісіяй, пастанаўляюць, ці перайсьці на хутары, ці аставіць вёску і будынкі на мейсцы, а толькі злучыць у адзін кавалак (адруб) усе шнуры, ці разьбіць вёску на некалькі пасёлкаў—залежна ад мяйсцовых гаспадарчых варункаў.

§ 44. На загаспадараваньне пры пераходзе на хутары павінна быць дадзена патрэбная помач ад ураду грашмі, інвэнтаром, дрэвам. Наагул усе работы, што да землеўпарадкаваньня, павінны праводзіцца на кошт дзяржавы.

§ 45. БХД імкнецца да палепшаньня гаспадарчага палажэньня вёскі праз пашырэньне земляробскай культуры, сельска-гаспадарчай коопэрацыі, павялічэньня абшару ўпраўнай зямлі, а прадусім—асушкі балот і лугоў. Дзеля гэтага БХД рупіцца аб закладань-

Да нас пішуць.

М. ЛЯХАВІЧЫ БАРАНАВІЦКАГА ПАВ.

Ляхавічы, паводле апошняга сьпісу (9.XII.31), маюць 4 547 жыхароў. У параўнаньні з сьпісам 1921 г. можна заўважыць вялікі прырост, бо аж 1.147 душ (тагды мястэчка лічыла 3.400 душ).

Паложана на раўніне, над ракою Ведзьмаю, мае даволі прыгожы рынак, на каторым адбываюцца бойкія таргі, мае касьцёл, царкву, пошту, сямігадовую школу, суд і нават свае адвакацкія сілы. На першы пагляд мястэчка робіць уражаньне рухлівай мясьціны, дзе грамадзкае, культурнае і палітычнае жыцьцё плыве сваімі ручайкамі, то набіраючы сілы, то ападаючы, як тая вада на вясну або летам.

Паводле нацыянальнасьці мястэчка ёсьць беларуска-жыдоўскім. Апошнія выбары у гарадзкую раду найлепш паказалі адносіны народных сіл: 6 радных жыдоўскіх і 6 хрысьціянскіх:з пасярод каторых 5 беларусаў і толькі адзін паляк, прыхільнік (паводле палітычнага сэзону) ББ. Гэтыя суадносіны у гарадзкой радзе найлепш сьведчаць аб нацыянальным складзе насельніцтва. Прыглядаючыся бліжэй да жыцьця хрысьціянскай палавіны мястэчка, можна сьцьвердзіць, што мястэчка ёсьць запраўды беларускім, ня толькі з свайго этнографічнага складу, але і з народнай сьведамасьці. Ёсьць тут і гурток Бел. Інстытуту Г.іК., які мае сваю бібліятэчку і разьвівае паводле сіл сваю працу на культурнай ніве. Належаць да гуртка найбольей дзейныя адзінкі з ляхавіцкай моладзі і старэйшых, сказаў-бы усіх беларускіх Ляхавіч. Адно толькі можна было-б закінуць ляхавіцкаму беларускаму грамадзянству — гэта малое заінтэрасаваньне беларускаю прэсаю. Прыходзіць у Ляхавічы некалькі нумароў „Б. Крыніцы,“ пару нумароў „Шляху Моладзі“ і «Хрысьціянскай Думкі». Вось і ўсё. Яно праўда, што на самыя Ляхавічы гэтага можа і хваціла-б, але трэба не забывацца, што каля Ляхавіч беларускае сялянскае мора, якое бурліць і шуміць, шукаючы выхаду з цяжкога палажэньня і выглядаючы усходніх і заходніх вятроў... Гэтае выгляданьне спрыяльнага „ветру“ адбірае ў людзей ахвоту да самастойнай працы, паралiжуе волю і настаўляе ўсе сілы чалавека не на працу, а на чаканьне... Найгоршая справа, што гэтаму чаканьню канца ня відаць, а тымчасам паралiжуецца воля замарожваецца маса народнай энэргіі, скрытая ў сялянскіх масах. На мой пагляд, пашырэньне літэратуры і разам з ею незалежніцкіх думак паддалі-б тутэйшаму дзейнаму сялянству ахвоту да працы, не агляднаючыся на ніякіх „дзядзькоў“. Бо тое, што будзе зроблена на ніве культурнай, эканамічнай або народнай сваімі рукамі, то будзе куды мацнейшым за „дзядзькаву“ работу, дый урэшце кожны „дзядзька“ калі і робіць нешта, то не задарма, а заўсёды вымагае, каб яму нагарадзіць.

Ляхавічане ў культурнай працы ўжо зрабілі пачатак, ладзілі нават апошнім часам цэлы рад лекцыяў і рэфэратаў, якія зацікавілі народныя гушчы, яшчэ толькі не хватае эканамічнай працы. А тут даўно ўжо пара пачаць работу. Такая коопэратыва, пры вялікай народнай сьведамасьці Ляхавічаў, аж просіцца, каб яе залажыць. Але яшчэ ўсё ня могуць прыбрацца з часам і з падшуканьнем спосабаў да яе залажэньня.

Адно, што мне кінулася пры агледзінах Ляхавіч — гэта агурочныя плянтацыі. Там у мястэчку па гарадох і нават у полі па загонах усюды раскінуты цэлыя плянтацыі агуркоў і гэта даўней служыла адным з важных даходаў Ляхавічаў. Агуркі салілі і рассылалі нават па далёкіх гарадох; цяпер аднак гэты промысел спыняецца, бо не iae карысьці. З пераховываньнем салёных агуркоў давялося мне бачыць зьяву, якой я ніdзе дагэтуль ня бачыў: перахоўваюць іх у рэчцы. Ходзячы над Ведзьмай, я заўважыў папярок рэчкі загароды. Пытаюся, што гэта мае значыць, на рыбу ці на што іншае яны пастаўлены? Адказваюць мне, што загароды пастаноўлены на тое, каб не паплылі бочкі з агуркамі, якія схаваны пад вадою... Там быццам яны могуць ляжаць пару гадоў і не сапсавацца. Ня гледзячы на ўсю дамыснасьць Ляхавічаў, справа з экспортам агуркоў стаіць штораз горай. І тут поле для коопэрацыі.

Абгледзі шы з большага Ляхавічы з боку народнага і эканамічнага, трэба пару слоў сказаць аб рэлігійным і іншых адносінах. Але аб гэтым другім разам.

Падарожны.

СУД ЗА „АД ВЕКУ МЫ СПАЛІ.“

Горадня. 10 кастрычніка с. г. Гарадзенскі Акружны Суд разглядаў справу жыхароў Галынскае гм. Горадзенскага пав. абвінавачаных з арт. 121 кк.: Я. і К. Баркоўскіх, Ул. Майсэвіча, А. Каравайчыка, М. Стрышкі, Ул. Андрушэвіча і М. Цэдзіча П. Хусьціка, Ул. Жыўлюка і Р. Мацейчыка, за тое, што 28 ліпня 1931 г. у сваей вёсцы пяялі беларускую марсэльезу „Ад веку мы спалі“ і іншую беларускую песьню, якая замяшчае ў сабе настуныя словы „на бой за славу і за волю народу беларускага свайго...“

Суд па доўгай нарадзе выдаў прысуд, якім засудзіў кожнага абвінавачанага па 6 месяцаў вастрогу.

З.

ТРУДНАЕ ПАЛАЖЭНЬНЕ.

Каленія Чорная, Пастаўскага пав. Наша вёска Чорная мела каля сотні гаспадароў. Жыхары яе, будучы малазямельнымі, захацелі пайсьці на «камасацыю» з дарэзкай зямлі ад двара Белае, абш. Пшэздзецкага. Так і зрабілі. Далалі малазямельным па 1, 2 і 3 гэкт. з варункам, што за кожны дадзены гэктар трэба плаціць па 100 зл. у год у працягу сарака аднаго году.

Толькі цяпер нашыя сяляне, як паправавалі плаціць, апомніліся, што гэктар зямлі будзе каштаваць чатыры тысячы злотых з лішнім. І такім парадкам нашыя сяляне апынуліся ў вельмі трудным палажэньні. З гэтае прычыны некаторыя ўжо адказаліся ад зямлі, каторую ім „дадалі,“ бо ні ў якім выпадку выплаціць за гэту зямлю ня могуць. І здаецца, што хутка адкажуцца ўсе.

Лявон Чорны.

Наша пошта.

Старому Беларусу За прысланае дзякуем, скарысталі, пішэце часьцей. Нумары газэт пастараемся выслаць. Газэту на пададзеныя адрэсы пасылаем „Царква і Народ“ як выйдзе Вы атрымаеце. У суд напішэце просьбу і Вам вышлюць паведамленьне, бо справу можа разглядзець бяз Вас хіба адвакат. Каталёг вышлюць.

Саўко. Грошы атрымалі ад Вас у жніўні, газэту пасылаем

Ключніку. Газэту будзем пасылаць і чакаем падпіскі.

Дру Пятроўскаму. Прсьбу спаўняем, але не забудзьцеся і аб нас.

Страчынскаму. Газэту пасылаем і лацінкай і гражданкай.

Коко. Дзякуем, зьмесьцім. Заяву перадалі.

Беларускі Адрыўны Календар на 1933 г.

выйшаў з друку і прадаецца ўва ўсіх беларускіх кнігарнях у Вільні.

Цана календара 85 гр. за штуку.

КНІГАРНЯ «ПАГОНЯ» (Вільня, Завальная вул. 6—10) паведамляе, што ўсякія заказы без надасланьня грашэй наперад, выконывацца ня будуць.

Грошы высылаць на чэкавае конто П.К.О. (konto czekowe P.K.O.) інж. Клімовіча № 180.485.

Да цэны кніжак далічваюцца расходы на перасылку поштай.

ні земляробскіх школаў, агранамічных пробных станцыяў, інструктарскіх пунктаў і г. д.

§ 46. Сяляне, для палепшаньня сваей гаспадаркі, павінны мець магчымасьць карыстацца з малапрацэнтнага і доўгатэрміновага крэдыту.

§ 47. БХД стаіць за справядлівыя цэны на прадукты сялянскія і фабрычныя. БХД процiў выкарыстываньня вёскі горадам і наадварот.

XIII Прыродныя багацьці.

§ 48. Лясы, воды, падземныя багацьці і інш., праз увагу на сваю агранічанасьць і агульна-грамадзкае значэньне, становяць уласнасьць самаўрадаў.

§ 49. На апал і будоўлю сялянскія Зямельныя Камісіі пры самаўрадах вызначаюць патрэбны лік лесу. Лясная палітыка дзяржавы павінна забясьпечыць грамадзянству таннае паліва і будаўляны матэрыял.

XIV. Асадніцтва.

§ 50. Чужацкае ваеннае асадніцтва і такая-ж прыватная колёнізацыя беларускіх зямель, як цалком несправядлівыя, павінны быць скасаваны.

XV. Работніцкія справы.

§ 51. БХД змагаецца за:
a) 8-гадзінны дзень працы;
b) права страйку, як абарону ад вызыскаў;
c) колектыўныя ўмовы дзеля забясьпечаньня лепшай аплаты;
d) забарону ночнай працы (вынятак там, дзе вымагаюць варункі тэхнічныя, або патрэбы грамадзкія);
e) забарону працы шкоднай здароўю кабеты;
f) забарону працы дзяцей у фабрыках да 16 гадоў;
g) дзяржаўнае страхаваньне работнікаў гораду і вёскі ад хваробы, калецтва, бэзработцыя і на старасьць;
h) законнае прызнаньне фабрычных работніцкіх камітэтаў з правам учасьця іх у нагдядзе за прадукцыяй і даходам у фабрыках, якія перайшлі ў колектыўныя формы валаданьня;
i) нядзельны адпачынак;
j) праўную апеку над працоўнымі на зямлі, у фабрыках і над хатняй службай — адумысловым уставадаўствам.

XVI. Падаткі.

§ 52. Мерай падаткаў для промыслу і гандлю павінен быць даход. Дзеля гэтага, хто больш мае даходу, той прагрэсыўна больш плаціць і падаткаў. Сяляне плацяць залежна ад працоўнай нормы і катэгорыі зямлі, а гараджане—ад сваей маемасьці. Катэгорыю зямлі ўстанаўляюць сялянскія Камісіі пры самаўрадах, а ацэнку маемасьці ў гарадох—такія-ж камісіі, складзеныя з гараджан.

§ 53. Усе падаткі пасрэднія (укосныя), як на соль, газу, цукар і інш. павінны быць скасаваны.

§ 54. Павінен быць уведзены адзіны падатак, гэта знача такі, які-б вызначаўся раз у год на адным наказе з разлажэньнем на раты і з азначэньнем тэрміну.

§ 55. Даход, патрэбны толькі на пражыцьцё, павінен быць ад падаткаў зусім звольнены.

§ 56. Збіраньне падаткаў павінна адбывацца справядліва, на аснове адумысловых законаў і павінна быць уведзена срогае караньне за падаткавыя надужыцьці.

XVII. Коопэрацыя.

§ 57. БХД стаіць за пашырэньне спажывецкай, вытворчай, крэдытнай коопэрацыі (коопэратыўныя крамы, малачарні, аляярні, льнярні, пазычкова-ашчадніцкія касы і г. д.) і дамагаецца на гэта шырокіх дзяржаўных крэдытаў.

§ 58. БХД дамагаецца, каб дзяржаўныя крэдыты йшлі на беларускія коопэратыўныя і гаспадарчыя арганізацыі і каб урад праводзіў краёвую эканамічную палітыку, з тым, каб капіталы аставаліся ў краі.

XVIII. Дапамога пакрыўджаным вайной.

§ 59. БХД дамагаецца: a) каб зьнішчаныя вайной гаспадаркі былі неадкладна адбудаваны на кошт дзяржавы і b) каб неадкладна былі прызнаны інвалідзкія рэнты для ўсіх ваенных інвалідаў, іхных удоваў і сірот.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.